# Адукацыя і Выхаванне

ISSN 0203-2031

7-8 '93

Образование и воспитание





*Этнапедагогіка*

**В. С. Болбас,**
*настаўнік акцябрскай школы № 3 (Гомельская вобласць)*

# Беларускі асветнік Саламон Рысінскі

***Сённяшняя цікавасць да народнай педагогікі дае ўсе падставы звярнуць асаблівую ўвагу на дзейнасць выдатнага айчыннага асветніка эпохі Адраджэння Саламона Фёдаравіча Рысінскага, які, бадай што, першым на беларускіх землях распачаў тэарэтычна асэнсоўваць багатую педагагічную спадчыну славянства.***

На жаль, пакуль што імя нашага знакамітага суайчынніка вядома даволі вузкаму колу навукоўцаў. Не ўпамінаецца яно нават у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. За выключэннем фрагментарнага матэрыялу, што змешчаны ў "Антологии педагогической мысли Белорусской ССР" (М., 1986), гісторыка-педагагічная навука амаль зусім не ўдзяліла ўвагі дзейнасці выдатнага прадстаўніка айчыннай грамадскай і педагагічнай думкі канца XVI — пачатку XVII ст. Акрамя шэрага польскіх вучоных, да спадчыны С. Ф. Рысінскага звяртаўся, відаць, толькі адзін айчынны гісторык літаратуры — Я. І. Парэцкі. Менавіта дзякуючы яго намаганням у апошнія гады з'явіліся некалькі навуковых артыкулаў і выдадзена манаграфія аб тэарэтычных пошуках выдатнага дзеяча беларускага Адраджэння [4].



На аснове ўскосных звестак устаноўлена, што нарадзіўся Саламон Фёдаравіч Рысінскі каля 1560 г. у вёсцы Рысін (тагачасная Полаччына, а цяпер — Себежскі раён Пскоўскай вобласці). Яго бацька, небагаты шляхціц Фёдар Ануфрыевіч Рысінскі, зрабіў усё, што змог, каб здольны сын атрымаў выдатную для свайго часу адукацыю. Вядома, напрыклад, што ў 1586 г. С. Рысінскі вучыўся ў прэстыжным Альтдорфскім універсітэце.

Саламону Фёдаравічу, які прысвяціў усё жыццё навуцы, але ніколі не меў дастатковых сродкаў для належнага ажыццяўлення сваіх творчых задум, часта даводзілася ісці на кампраміс з рэчаіснасцю, каб дасягнуць пастаўленай мэты. Сам ён пісаў: "Абліваючыся потам у гэтым пыле, з вялікай цяжкасцю і без сна здабываю хлеб" [4; 9]. Яму давялося настаўнічаць у невялікіх мястэчках Беларусі, у гарадах Польшчы і Германіі, быць прыдворным паэтам у князёў Радзівілаў, прымаць удзел у арганізацыі школьнай справы на радзіме, вывучаць антычнасць, займацца выдавецкай і перакладчыцкай дзейнасцю. Асветнік неаднойчы бываў за мяжой і меў там кантакты з вядомымі вучонымі. Цікава, што ў той час, калі яго землякі называлі сябе перад іншаземцамі рускімі ці літоўцамі, Саламон Фёдаравіч прадстаўляўся леўкарусам, гэта значыць беларусам, бо "леўкас" па-грэчаску — "белы".

Як гарачы патрыёт сваёй радзімы, С. Рысінскі рашуча адмятаў псеўдапатрыятызм, нацыянальную фанабэрыю, ігнараванне чужога вопыту. У адным са сваіх лістоў ён пісаў: "Не ведаю, якой асалодай родная зямля ўсіх вабіць і не дазваляе аб сабе забыць, але клянуся Гераклам, калі ёсць вельмі зручны момант вынесці ногі з гнязда і ўпрыгожаную дамашнімі пер'ямі галаву высунуць вонкі, хочацца насычанаму айчынным паветрам панюхаць і духу іншаземнага. Ці доўга мы будзем весці манастырскае жыццё, ці доўга, прывязаныя да гэтых вуглоў, будзем задавальняцца вучэннем, амаль засоленым і завяленым?" [4; 31].

Сур'ёзна займаючыся ўдасканаленнем сваіх ведаў у галіне філасофіі, літаратуры, педагогікі і этнаграфіі, асветнік бачыў крыніцу эканамічнага і маральнага абнаўлення грамадства ў распаўсюджанні навуковых ведаў. Саламон Рысінскі быў у ліку арганізатараў вядомага фарпосту адукацыі і гуманізму — Слуцкай гімназіі. Дабрачыннае жыццё, у яго ўяўленні, заўсёды грунтуецца на глыбокіх разумовых пачатках, на свядомым асэнсаванні рэчаіснасці. Але, паводле меркавання С. Рысінскага, адны толькі веды і вера без добрых спраў не могуць прывесці да маральнага ўдасканалення грамадства. На гэтай глебе адбылося яго збліжэнне з прадстаўнікамі "левага крыла" Рэфармацыі. Педагог падзяляў іх погляды аб свабодным тлумачэнні "свяшчэннага пісання", аб сапраўднасці рэлігіі ў межах розуму, аб адмаўленні першароднага граху і іншыя. Але Саламон Фёдаравіч не згаджаўся з метадамі вырашэння праблемы маёмаснай няроўнасці і вызвалення ад прыгнёту праз стварэнне хрысціянскіх абшчын з грамадскай уласнасцю. Як і Сымон Буд-

ны, ён прытрымліваўся ідэі "адукаванага манарха", які павінен абараняць інтарэсы ўсіх саслоўяў.

Саламон Рысінскі супрацоўнічаў з Віленскай пратэстанцкай абшчынай, перакладаў для яе псалмы Давіда на польскую мову. Заслугоўвае ўвагі і тое, што, у адрозненне ад многіх тагачасных асветнікаў, ён не зрабіўся светарам, а ўсё жыццё заставаўся свецкім дзеячам. С. Рысінскі быў добра вядомы як перакладчык. Ён, напрыклад, пераклаў на лацінскую мову шэраг твораў заснавальніка панегірычнай плыні ў беларускай літаратуры Андрэя Рымшы.

У кнізе наш выдатны зямляк бачыў сродак дасягнення асветніцкіх мэтаў, а таму актыўна займаўся выдавецкай дзейнасцю. З яго ўдзелам рыхтаваліся да друку на Беларусі і за яе межамі многія значныя навуковыя працы. Ён супрацоўнічаў з шырока вядомай тады Любчанскай друкарняй. З'яўляючыся рознабакова адукаваным чалавекам, Саламон Рысінскі пакінуў глыбокі след у развіцці грамадска-навуковай думкі, унёс значны ўклад у скарбніцу нацыянальнай культуры.

Крытычны падыход, лагічнасць і гуманістычная накіраванасць праяўляюцца ўжо ў першых працах С. Рысінскага, напрыклад у яго раннім творы "Дзве кнігі лістоў", які быў надрукаваны ў нямецкім горадзе Альтдорфе ў 1587 г. Гэтае выданне знаходзіцца цяпер у адзінкавым экземпляры ў Гамбургскай дзяржаўнай бібліятэцы.

Творчай дзейнасці мысліцеля не маглі перашкодзіць ні тлум княжацкіх харомаў, ні знаходжанне ў вясковай глухамані. Менавіта ў беларускай правінцыі ў 1610 г., маючы на руках парыжскае выданне "Маральных лістоў да Луцылія" — асноўнага твора рымскага філосафа-эклектыка I ст.н.э. Сенекі, С. Рысінскі стварае арыгінальную філасофска-этычную працу "Кніга заўваг і тлумачэнняў да "Лістоў" Л. А. Сенекі..." Праз дзесяць гадоў яна была выдадзена ў Нюрнбергу. Арыгінал гэтых каментарыяў належыць цяпер народнай бібліятэцы г. Кракава [3; 123 — 124].

Захаваўся да сённяшняга дня шэраг друкаваных і рукапісных навуковых даследаванняў С. Рысінскага па творах антычных пісьменнікаў, а таксама ягоныя панегірычныя вершы пра подзвігі і заслугі князёў Радзівілаў, працы па літаратуразнаўстве, лісты да сяброў і інш. Аднак галоўным здзяйсненнем мысліцеля-педагога заслужана лічыцца напісанне зборніка "Польскія прымаўкі, сабраныя Саламонам Рысінскім... васемнаццаць соцень" (Любча, 1618). Карпатлівай падрыхтоўцы яго вучоны аддаў больш за трыццаць гадоў жыцця. Тое, што ў назве стаіць слова "польскія", не павінна бянтэжыць чытачоў, якія ведаюць гісторыю Бацькаўшчыны: яе землі ўваходзілі ў той час у склад Рэчы Паспалітай. С. Рысінскі параўноўваў беларуска-польскія прымаўкі з лацінскімі, нямецкімі, італьянскімі і афарыстычнымі творамі іншых народаў. Гэта была адна з першых айчынных навуковых прац па фальклоры. Пасля яе часта перавыдавалі. Збіраючы па крупінках згусткі славянскай мудрасці, даследчык захаваў іх простанароднае гучанне, стварыў сапраўдны гімн педагагічнаму генію народа. Выхаваўчае значэнне названага выдання цяжка перабольшыць, таму слушнай уяўляецца сучасная гіпотэза аб выкарыстанні яго як навучальнага дапаможніка ў Слуцкай гімназіі. Фальклорны зборнік С. Рысінскага хутка набыў папулярнасць і ў іншых краінах. З прыхільнасцю паставіўся да яго славуты чэшскі педагог Ян Амос Коменскі, які ў сваіх тэарэтычных даследаваннях плённа выкарыстоўваў многія здабыткі свайго беларускага калегі [2; 133].

Кніга таленавітага айчыннага педагога і сёння мае не толькі пазнавальна-гістарычнае значэнне, бо, як зазначае Я. І. Парэцкі, "каля 500 прыказак і прымавак, з 1800 прадстаўленых у першым выданні, захаваліся ў Беларусі да нашых дзён" [4; 52].

Чэрпаючы мудрасць з народных вытокаў, узбагачаючы свае веды дасягненнямі тагачаснай сусветнай грамадскай думкі, С. Рысінскі ўзняўся да вяршынь сапраўдных каштоўнасцей чалавецтва. Цесная сувязь з народам надавала яго гуманізму ярка выражаную дэмакратычную афарбоўку. Мысліцель быў перакананы, што сапраўдныя ўзоры дабрачыннасці трэба шукаць у народзе. Ён сцвярджаў, што "народ — майстар рабіць памылкі, але агульная думка і вопыт —правільныя" [4; 50]. Асветнік неаднаразова падкрэсліваў, што кожны сапраўдны вучоны-педагог заўсёды абапіраецца на багаты выхаваўчы набытак папярэдніх пакаленняў, сканцэнтраваны ў вуснай народнай творчасці. Для С. Рысінскага гэта была жыватворная крыніца, з якой ён чэрпаў свае ідэі і дзе выяраў іх сапраўдную каштоўнасць.

Галоўнай мэтай народнай педагогікі заўсёды з'яўлялася выхаванне высокамаральнага чалавека. Менавіта ў гэтым накірунку і разгарнулася асноўная тэарэтычная і практычная дзейнасць Саламона Рысінскага. Надаючы маральнаму выхаванню першараднае значэнне ў станаўленні прыстойнай асобы, ён абапіраўся на педагагічныя погляды народа і лічыў, што найважнейшае ў такім працэсе — надзея на ўласныя сілы, а не чаканне літасці ад лёсу. Рысінскі пісаў, што выхаванне "засцерагае чалавека ад звярынай прыроды і робіць яго больш чалавечным" [4; 25].

Мысліцель выводзіць выхаваўчыя мэты з зямных патрэб людзей. У сваім разуменні маральнага ідэалу чалавека асаблівы акцэнт ён робіць на шырокім інтэлектуальным развіцці. Яно ўзгоднена з глыбіннымі каранямі духоўнай спадчыны народа і цесна спалучаецца з адшліфаванымі часам дабрачыннасцямі чалавека, бо "каго бог хоча пакараць, спачатку пазбаўляе розуму" [4; 143].

Важна адзначыць, што, пры ўсёй ідэалізацыі адукаванасці, асветнік лічыў яе хоць і неабходнай, але далёка не дастатковай умовай развіцця асобы. С. Рысінскі згаджаўся з пастулатам народнай педагогікі, у якім

сцвярджалася, што “розум без дабрыні — гэта меч у руках вар’ята” [1; 24].

Грунтуючыся на народных уяўленнях пра дабро і зло, вучоны-педагог уключае ў змест маральнага выхавання фармаванне такіх якасцей, як чалавекалюбства, добразычлівасць, нацыянальны патрыятызм, справядлівасць, любоў да працы, разважлівасць, памяркоўнасць, мужнасць, самакрытычнасць, павага да старэйшых, сціпласць, паслухмянасць, мэтанакіраванасць і іншыя. Апора мысліцеля на здабыткі народнай педагогікі садзейнічала таму, што ён не толькі змяніў распаўсюджаныя ў навуцы акцэнты ў ацэнцы тых або іншых маральных каштоўнасцей, але многія з іх напоўніў новым сэнсам, адпаведным новай эпосе, надаўшы ім выразнае гуманістычна-дэмакратычнае гучанне. Так, напрыклад, патрыятызм у яго пазбаўлены якой бы там ні было нацыянальнай пыхлівасці. Справядлівасць, на думку С. Рысінскага, кожны мае права і павінен адчуць яшчэ ў гэтым жыцці, а не толькі на тым свеце. Сціпласць, паслухмянасць, цярплівасць ён не зводзіць да ўзроўню знішчэння асобы, што было ўласціва сярэдневяковым аскетызму і дагматызму, а дапаўняе пачуццём уласнай годнасці, бо “на схіленае дрэва і козы залазяць” [4; 144].

Спасціжэнне асноватворных ісцін народнай педагогікі садзейнічала ўсталяванню ў С. Рысінскага думкі, што маральнасць чалавека па-сапраўднаму фармуецца і найбольш поўна праяўляецца ў грамадскім жыцці. У адрозненне ад шэрага тагачасных заходнееўрапейскіх педагогаў, ён лічыў, што вышэйшыя дабрачыннасці чалавека не могуць быць выхаваны па-за рамкамі чалавечай супольнасці. Дрэнны чалавек, на яго думку, можа здзейсніць свае ганебныя жаданні і несумленныя мэты толькі пры адсутнасці належнага кантролю. Але грамадства выступае не столькі кантралёрам паводзін і ўчынкаў, колькі суб’ектам свядомага выхавання высокай маральнасці. Менавіта пры такой умове магчыма ўсталяванне галоўнага прынцыпу грамадскага паразумення: “Жыві з людзьмі так, як быццам гэта Бог бачыць” [4; 83].

Дэмакратызм поглядаў дазволіў С. Рысінскаму разбурыць саслоўна-карпаратыўныя феадальныя ўяўленні аб “манаполіі” на высокія маральныя вартасці. Ён абгрунтоўвае думку, што гонар, сумленне, годнасць, доблесць не перадаюцца ў спадчыну, а могуць быць здабыты толькі шляхам уласных намаганняў. Вучоны рашуча аддзяляе высакароднасць ад высакароднага паходжання. Ён падкрэслівае, што на вяршыню духоўнасці могуць падняцца і простыя людзі.

Патрабаваннямі народнай педагогікі падмацоўвае С. Рысінскі “залатое правіла маральнасці”: “Таго, што табе не люба, не рабі і другому”. Сінтэзуючы прынцыпы народнай педагогікі і палажэнні хрысціянскай этыкі, вучоны бачыць крытэрый маральнасці ў практычным служэнні людзям, агульнаму працвітанню. Маральны ўзровень чалавека, сцвярджаў мысліцель, будзе тады чаго-небудзь варты, калі ён увасабляецца ў канкрэтных справах. Нават стаўленне да Бога і служэнне яму С. Рысінскі вымярае адносінамі да людзей: “Хто людзей не саромеецца, той Бога не баіцца”, — згаджаецца з народнай прымаўкай выдатны вучоны. Ён падкрэслівае, што дзень, на працягу якога ты не зрабіў што-небудзь карыснае для іншых, трэба лічыць загубленым. Наогул жа, няспынна ўхваляючы жыццёвую актыўнасць прыстойнай асобы, ён сцвярджаў, што бяздзейснае і ціхамірнае існаванне мала чым адрозніваецца ад смерці.

Згодна з народнымі ўяўленнямі маральнасць чалавека перш за ўсё праяўляецца тады, калі ён ацэньвае і судзіць спачатку сябе, а потым іншых. У жыцці ж часта бывае наадварот, аб чым трапна і вобразна пісаў у адным з эпісталярных твораў С. Рысінскі: “Чалавечыя вочы лепш бачаць чужое, чым сваё. Па-за сабой яны дзейнічаюць падобна рысі, унутры — як крот” [4; 32]. Адной з галоўных перашкод для інтэлектуальна-маральнага ўдасканалення грамадства ён лічыў духоўнае заняволенне асобы. Таму яго погляды прасякнуты ідэаламі верацярпімасці, свабоднага выказвання думак і меркаванняў. Яму вельмі імпанавала прымаўка: “Думка падаткаў не плаціць” [2; 131]. Бадай жа, самай галоўнай заслугай выдатнага беларускага педагога ў фармаванні тэарэтычных асноў маральнага выхавання з’яўляецца распрацоўка і абгрунтаванне шляхоў духоўнага развіцця асобы. У адпаведнасці з народнымі ацэнкамі розуму, мудрасці маральнае аздараўленне грамадства, на думку вучонага, павінна грунтавацца на шырокай асвеце ўсіх слаёў насельніцтва.

Развіваючы лепшыя народныя традыцыі ў выхаванні падрастаючых пакаленняў, С. Рысінскі акцэнтуе асаблівую ўвагу на гуманных падыходах да дзяцей: “Адабраць сілай можна, а даць нельга” [4; 143]. Мысліцель распрацоўвае ідэі ўліку індывідуальнасці дзіцяці і яго ўзросту. У свой зборнік ён уключае такую прымаўку: “Гні галінку пакуль маладзенька, вырасце — зламаецца” [1; 131].

Педагог перасцерагае, што ў выхаваўчым працэсе вынікаў можна дабіцца толькі ўпартай, карпатлівай працай. Такія думкі былі сугучныя многім формулам народнай педагогікі, у якіх праца трактуецца як універсальны сродак арганізацыі ўсіх бакоў грамадскага і асабістага жыцця. У маральным выхаванні С. Рысінскі аддаваў перавагу метаду перакanання і ўсямерна ўхваляў выхавацеляў, якія “...словамі імкнуцца выхоўваць норавы людзей” [4; 25]. Таму, як ён лічыў, настаўнік абавязкова павінен валодаць майстэрствам красамоўства. Асветнік нават дае шэраг практычных парад, як найлепш выкарыстоўваць ідэі і афарызмы светачаў навукі і народную мудрасць.

Вялікую ўвагу надае вучоны прыкладу, апрабаванаму народным вопытам: “Недалёка ад дрэва падае яблык” [4; 150]. Адметна і тое, што ў дапаўненне да распаўсюджаных вытрымак з антычных ці біблейскіх

сюжэтаў С. Рысінскі прапаноўваў педагогам шырока выкарыстоўваць, як найбольш зразумелыя і даступныя, прыклады, убачаныя ў асяродку людзей. Да дзейсных вынікаў, на яго думку, прыводзіць і метад сістэматычных практыкаванняў: "Кропля доўбіць камень не сілай, а частым паданнем" [4; 26]. Таму С. Рысінскі заклікаў да разумнай паступовасці, асабліва пры перавыхаванні, нагадваючы народную мудрасць: "Ціхая вада берагі падмывае" [4; 146].

***Такім чынам, ідэі народнай педагогікі з'явіліся трывалым падмуркам маральна-выхаваўчых распрацовак айчыннага мысліцеля, якія актыўна ўваходзілі ў паўсядзённы ўжытак беларускіх школ. Ды і сёння большасць прац С. Рысінскага маюць не толькі пазнавальна-гістарычную каштоўнасць, а з поспехам могуць выкарыстоўвацца і выкарыстоўваюцца ў айчыннай педагагічнай тэорыі і практыцы.***

Літаратура

1. Каханоўскі Г. А., Малаш Л. А., Цвірка К. А. Беларуская фальклярыстыка: Эпоха феадалізму. — Мн., 1989.
2. Парэцкі Я. І., Прэнская Ю. І. Любчанскі зборнік прыказак і прымавак, сабраны і выдадзены С. Рысінскім у 1618 г. // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. — 1964. — № 1. — С. 124 — 133.
3. Порецкий Я. И. Некоторые "Письма к Люцилию" Л. А. Сенеки в "Конъектурах" Соломона Рысинского // Вопросы филологии. Вып. 1. — 1971. — С. 123 — 136.
4. Порецкий Я. И. Соломон Рысинский: Solomo Pantherus Leucorussus. Конец XVI — нач. XVII в. — Мн., 1983.

***The teacher of history in Oktyabr secondary school 3 (Gomel Region) V. Bolbas analyses pedagogical ideas, considered in the works of the prominent Belorussian Thinker of the XVII centure Solomon Rysinsky.***

***Der Lehrer W. Bolbas, der in der Schule № 3 (Gomelgebiet) die Geschichte unterrichtet, analisiert die padagogischen Jdeen, die in den Werke des beruhmten belorussischen Aufklarungsfunktionar Solomon Rysinski (XVII Jahrhundert) widerspiegeln.***



